# ДАСЛЕДЧЫК. ТВОРЦА. НАСТАЎНІК



**Да яго аўтарытэтнай думкі прыслухоўваюцца калегі-навукоўцы. Яго даследчыцкім энтузіязмам «зараджаюцца» маладыя філолагі. Яго манаграфіі з'яўляюцца ўзорнымі для некалькіх пакаленняў літаратуразнаўцаў. Адзін з найвыдатнейшых айчынных даследчыкаў літаратуры — доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась Іосіфавіч МУШЫНСКІ 24 студзеня адзначыў 85-годдзе.**

Унёсак Міхася Мушынскага ў айчыннае літаратуразнаўства складана пераацаніць. Толькі ўявіце: яго даследчыцкі набытак складае больш як тры сотні навуковых артыкулаў, амаль паўтара дзясяткі індывідуальных манаграфій, пад яго пільным кіраўніцтвам да чытача прыйшлі 13 навукова каментаваных збораў твораў беларускіх пісьменнікаў: Якуба Коласа, Янкі Купалы, Івана Мележа, Міхася Лынькова, Максіма Гарэцкага, Піліпа Пестрака, Змітрака Бядулі, Петруся Броўкі, Міхася Зарэцкага, Максіма Багдановіча... Ён стаў адным з заснавальнікаў беларускай школы тэксталогіі, плённа працуе ў галіне літаратурнай крытыкі.

Гэта — толькі факты і лічбы. Але яшчэ больш уражваюць неверагодная натхнёнасць Міхася Іосіфавіча, яго даследчыцкі энтузіязм і адкрытасць да ўсяго новага. Яго метадалагічныя падыходы да вывучэння беларускай літаратуры — сучасныя і актуальныя, ён прымае розныя погляды і канцэпцыі, працуе ў кірунку вызначэння месца беларускай літаратуры ў сусветным літаратурным працэсе.

Голас Міхася Мушынскага — важны і аўтарытэтны ў навуковай супольнасці, да яго прыслухоўваюцца, яго паважаюць многія пакаленні даследчыкаў. Колькі гадоў таму, калі зацвярджалася тэма маёй кандыдацкай дысертацыі ў галіне параўнальнага вывучэння беларускай і амерыканскай літаратуры пачатку XX стагоддзя, Міхась Мушынскі быў адным з нямногіх аўтарытэтаў, які сваім узважаным меркаваннем пераканаў іншых у патрэбнасці напісання такой працы. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што гэта смела, нова і сучасна. Я бясконца ўдзячная шаноўнаму даследчыку за такую значную падтрымку.

Дзесяцігоддзі архіўнай і тэксталагічнай працы, тэарэтычных абагульненняў, разгляду розных версій рукапісаў, аналізу літаратурнай спадчыны беларускіх пісьменнікаў... Дзякуючы Міхасю Мушынскаму мы маем поўны летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа — неверагодна таленавітае і непаўторнае даследаванне, узорнае для беларускай філалогіі; даследаванні жыццёвага і творчага шляху Міхася Гарэцкага і Міхася Зарэцкага. Менавіта Міхась Іосіфавіч у пачатку 1990-х гадоў акрэсліў асноўныя прынцыпы, у адпаведнасці з якімі павінна ствараца новая гісторыя беларускай літаратуры, стаў адным з аўтараў гісторыі беларускай літаратурнай крытыкі 1920-х — 1980-х гадоў.

Нельга не адзначыць і педагагічны талент Міхася Мушынскага. Добрым настаўнікам і дарадцам яго лічаць не толькі колішнія студэнты, магістранты, аспіранты, але і калегі. Ён валодае незвычайным уменнем вучыць даследчыцкай дзейнасці, смела распавядае пра сваю ўласную метадалогію вывучэння жыцця і творчасці літаратараў у артыкулах і манаграфіях. Так, адна з найярчэйшых філалагічных работ апошняга часу — кніга Міхася Мушынскага «Мае Каласавіны: З вопыту вывучэння літаратурнай і грамадска-культурнай дзейнасці Якуба Коласа».

Варта падкрэсліць, што і сёння Міхась Мушынскі — актыўны ўдзельнік навуковага і літаратурнага жыцця сталіцы. Ён прымае ўдзел у прэзентацыях новых кніг і выступае падчас імпрэз, піша новыя работы і з задавальненнем дапамагае калегам. Кожнае выступленне, прамова Міхася Іосіфавіча змяшчаюць не толькі канстатацыю зробленага, набытага, але і падкрэсліваюць перспектыўныя кірункі развіцця філалогіі, праблемы і недапрацоўкі, што сёння існуюць у літаратуразнаўстве. Гэта дае глебу для роздумаў, натхняе на пошук важных адказаў і своечасовых рашэнняў.

Віншуем з юбілеем, Міхась Іосіфавіч! Няхай пад вашым пільным кіраўніцтвам будзе напісана яшчэ многа выдатных работ.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**

■ Культпаход

## З ГІСТОРЫІ АДВАЖНЫХ БРАНДМАЙСТРАЎ

**У Бабруйскім мастацкім музеі імя Г.Г. Паплаўскага можна пабачыць калекцыю ўнікальных фота, якую сабралі ратавальнікі.**

На здымку — людзі ў нязвыклай амуніцыі і вастраканцовых, быццам волатаўскія, шлемах. Мяркуючы па фота, у 1928 годзе на шклозаводзе ў Глушы Бабруйскага раёна працавала вялікая пажарная дружына. А гэта — ужо ратавальнікі 1-й гарадской пажарнай каманды. Яны трымаюць напагатове сваіх коней, гатовых у любы момант сарвацца з месца і ляцець на барацьбу са стыхіяй. Дарэчы, у 50—60-я гады ў Магілёўскай вобласці не было роўных бабруйчанам у пажарным спорце. Самыя яркія моманты тых часоў можна таксама прасачыць па фота. Бабруйская каманда восем гадоў запар трымала лідзіруючыя месцы, пра што сведчыць пераходны сцяг, які застаўся тут назаўсёды.

— Гэтыя і іншыя здымкі мы збіралі ўсім аддзелам амаль 10 гадоў, — расказвае **старшы інспектар Бабруйскага гарраддзела па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый СКАЗАЎ.** — Шукалі рэдкія фота ў альбомах сваіх родных, апытвалі людзей. Справа захапіла ўсіх. Бо наша гісторыя цесна звязана з гісторыяй горада. Быў нават перыяд, калі ў адным будынку размяшчаліся пажарнае дэпо і гарадскі тэатр.

Магчымасць здзейсніць падарожжа ў мінулае пажарнай справы і азнаёміцца з яе сучасным станам можна, пабываўшы на выставе ў Бабруйскім мастацкім музеі імя Г.Г. Паплаўскага. Яна будзе працаваць да канца гэтага месяца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з калекцыі Бабруйскага гарраддзела па НС**



## ПЛАНЕТА БЕЗ «ВЫЯВЫ» І ІМЯ

Навукоўцы адшукалі новую, дзявятую, планету Сонечнай сістэмы

**Спецыялісты Каліфарнійскага тэхналагічнага інстытута (ЗША) аб'явілі, што выяўленая імі планета знаходзіцца прыкладна ў 20 разоў далей ад Зямлі, чым Нептун. У выпадку прызнання адкрыцця новая планета стане дзявятай у Сонечнай сістэме.**

Дарэчы, саму планету амерыканцы ў тэлескоп не бачылі, а зрабілі высновы, пасля аналізу з дапамогай камп'ютарнага мадэлявання даных па яе ўплыву на гравітацыйнае адхіленне іншых нябесных цел. Існуе меркаванне, што ў свой час гэтая планета магла быць выкінутая на ўскраіны Сонечнай сістэмы пад уздзеяннем гравітацыйных сіл Юпітэра або Сатурна. Назву планеце яшчэ не далі, але спецыялістам удалося вызначыць розныя яе параметры. Падлічана, што важыць яна ў 10 разоў больш за Зямлю, а па хімічным складзе нагадвае двух газавых гігантаў — Уран і Нептун. Камп'ютарнае мадэляванне паказвае, што планета-ізгой перамяшчаецца вакол Сонца па выцягнутай арбіце (і ў нахіленай адносна арбіты Зямлі плоскасці) з перыядам абарачэння ў 15 тысяч гадоў. Доказ існавання нябеснага цела зойме да пяці гадоў. Верагоднасць таго, што гэтае адкрыццё памылковае, складае 0,007%.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

■ Добрая ідэя

## ЗНІЖКА ЗА МОВУ

**Дзякуючы ініцыятыве другакурсніцы філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Ганны Плахатнюк, моладзь у абласным цэнтры імкнецца размаўляць па-беларуску.**



Ва ўсякім разе, іх імкненне падтрымліваецца невялічкімі зніжкамі, якія прапануюць у некалькіх кавярнях.

Ганна расказвае, што родную мову яна пачала ўспрымаць літаральна з малаком маці — настаўніцы беларускай мовы. Потым у школе дзяўчына неаднаразова станавілася пераможцай шматлікіх конкурсаў і алімпіяд, у тым ліку рэспубліканскага ўзроўню. Акрамя таго, яна перамагала ў паэтычных і вакальных конкурсах. Таму і выбар вышэйшай навучальнай установы быў заканамерным:

— Мне крыўдна, што некаторыя паступаюць на беларускую філалогію толькі таму, што больш нікуды не пройдуць. У маім выпадку гэта не так. Мне падабаецца вучыцца ва ўніверсітэце. Ёсць шмат выкладчыкаў, якія вельмі цікава чытаюць лекцыі і заўсёды расказваюць нешта новае. Што тычыцца ўвасобленай ідэі, яна зарадзілася, калі мы рыхтаваліся да абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года». Трэба было на конкурс «Мой праект у Год моладзі» падрыхтаваць нешта арыгінальнае. Мы сталі шукаць, што ж гэта можа быць: нешта сацыяльнае, што нам, студэнтам, цікава. Размова зайшла аб праблеме існавання беларускай мовы ў сучасным грамадстве, у маладзёжным асяродку. Прыйшлі да высновы, што актуальна будзе прапанаваць у месцах адпачынку моладзі зніжкі за абслугоўванне — для тых, хто размаўляе па-беларуску. Вось так і нарадзілася акцыя пад назвай «Будзем гаварыць па-беларуску».

Ганна на абласным этапе конкурсу стала пераможцай і прадстаўляла Гомельшчыну на рэспубліканскім узроўні конкурсу. Але ж галоўнае, што з лёгкай рукі ідэя пачала дзейнічаць у чатырох пунктах грамадскага харчавання, дзе любіць бавіць час моладзь.

— Многія кіраўнікі згадзіліся з радасцю. І наведвальнікі, нават калі мову не ведаюць дасканала, імкнуцца хаця б вітацца па-беларуску. Гэта людзям цікава, і калі пашыраць такую практыку, магчыма, урэшце яны будуць імкнуцца размаўляць заўсёды на роднай мове, — верыць Ганна Плахатнюк. — Па дамоўленасці з кіраўнікамі кавярняў мы з сябрамі ўсталявалі спецыяльныя шыльды аб зніжцы і распаўсюдзілі гэтую інфармацыю праз сацыяльныя сеткі.

Ганна не прапускае ніводнай магчымасці для прапаганды роднай мовы. Яна двойчы была капітанам у тэлевізійнай гульні на БТ 3 «Размаўляем па-беларуску» і двойчы яе каманда перамагала:

— Мне хочацца, каб усе беларусы размаўлялі па-беларуску. Без мовы мы — не адметная нацыя. За мяжой часта лічаць, што Беларусь — гэта паўночна-заходні край Расіі. І гэта вельмі крыўдна. Менавіта таму мы павінны быць адметнай краінай са сваёй гісторыяй, культурай і мовай.

Ганна пакуль што вучыцца толькі на другім курсе ўніверсітэта і не спяшаецца вызначыцца з далейшым шляхам у жыцці. Ёсць яшчэ час паразважаць над сваёй будучыняй. Яна любіць творчасць у самых розных яе праявах, займаецца ў самадзейным тэатры, спявае, піша вершы, артыкулы... Не выключае, што можа стаць і настаўніцай у школе — як маці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*


ОСТРОВ ЧИСТОТЫ

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Яркие эмоции вместе с CLEANIC!»

**1. Организатор.** Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг». Местонахождение Организатора: ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, д. Липнишки, Республика Беларусь. Почтовый адрес: ул. Каховская, д. 70а, пом. 8, 220068, г. Минск.

**2. Наименование Рекламной игры:** «Яркие эмоции вместе с CLEANIC!».

**3. Территория проведения** – дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения:** 10.12.2015 – 31.01.2016 (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Свидетельство № 2688** о государственной регистрации рекламной игры «**Яркие эмоции вместе с CLEANIC!**» от 26 ноября 2015 года, выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

6. В рекламной игре приняло участие 1322 участника.

7. Призовой фонд рекламной игры по всем призам разыгран в полном объеме.

8. Фамилия, инициалы и населенный пункт победителей.

**Приз: 2 подарочных сертификата MILAVITSA номиналом 500 000 бел. руб.**

**Срок погашения до 18 февраля 2016 г.**

Розыгрыш: Маляревич А.С. (г. Минск), Воинова В.О. (г. Минск), Орлеанская Е.С. (Минская обл., Минский р-н, д. Луговая Слобода), Марчук Н.В. (Брестская обл., Столинский р-н, г. Давид-Городок), Козленко В.И. (г. Минск), Лысенко М.Н. (г. Минск), Прузан Р.П. (г. Минск), Воронкова К.В. (г. Минск), Брилевская М.Я. (г. Минск), Кирсанова Т.А. (Минская обл., Пуховичский р-н, д. Моторово), Салович Д.Н. (г. Минск), Черник В.А. (г. Минск), Бычко Ю.А. (г. Столбцы), Плаксенюк З.В. (г. Борисов), Иванец Е.В. (г. Минск), Шлыкова С.Ч. (г. Минск), Желудок Г.А. (г. Вилейка), Крылова К.В. (г.Минск), Васильева Е.П. (г. Минск), Анищенко И.Н. (г. Минск).

**Приз: санаторно-курортная путевка в санаторий «СПУТНИК» ОАО «Беларусбанк» номиналом 7 200 000 бел. руб.**

Розыгрыш: Ширинова О.Ф. (г. Минск), Гейба Т.И. (г. Минск), Якушина А.Б. (г. Минск), Шпакова С.М. (г. Минск), Чеботарева И.И. (г. Бобруйск).

**Приз: тур (на двоих) в Тайланд 10 ночей с 04.03.2016 по 16.03.2016 с вылетом из Минска номиналом 44 334 259 бел. руб.**

Розыгрыш: Тумановская Ольга Владимировна (аг. Лучники).

9. Телефоны для справок: Velcom: +375 (29) 354 49 91, городской телефон: 8 017 335 07 06 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни.

Полные правила рекламной игры были опубликованы в газете «Звезда» от 8 декабря 2015 года и на сайте **www.ostrov-chistoty.by.**

Свидетельство о гос. регистрации № 2688 от 26 ноября 2015 года, выдано Министерством торговли Республики Беларусь.